ДОБРЫ ВЕЧАР
Добрый вечер

СТАЛІЦА

ІНФАРМАЦЫЙНА-РЭКЛАМНЫ ШТОТЫДНЁВІК № 3 9 СНЕЖНЯ 1994 ГОДА КОШТ 100 РУБ.

ЧАЛАВЕК, ЯКІ ПРЫЙШОЎ НА МЕСЦА М.ЧЫГІРА

Ў "БЕЛАГРАПРАМБАНК" 6



Фота Юрыя ЗАХАРАВА.

ГОРЬКИЙ ПРИМЕР С «МММ» ДЛЯ МИНЧАН НЕ ПОУЧИТЕЛЕН

В Беларуси разгорелся первый скандал, связанный с обманом владельцев приватизационных чеков. Как стало известно СИМ, Прокуратурой республики разыскиваются трое учредителей АО «Междорстройкомплектинвест» (фамилии мошенников следствие пока держит в тайне). 14 октября нынешнего года эти предприимчивые люди зарегистрировали в Минском горисполкоме акционерное общество и, не имея лицензии Министерства по управлению госимуществом, объявили о приеме от населения приватизационных чеков под баснословно высокие проценты. Забыв о горьком опыте российских акционеров, многие минчане бросились в «Междорстройкомплектинвест». Всего за три дня владельцы этого АО приняли от населения приватизационных чеков на сумму 4,5 миллиона рублей, продали и благополучно скрылись с вырученными деньгами.

СИМ.

СТАЛІЦА

Заснавальнік
журналісцкі калектыў рэдакцыі газеты «Добры вечар»
Зарэгістравана ў Міністэрстве культуры і друку Рэспублікі Беларусь пад № 987

Галоўны рэдактар Анатоль ЗЭКАЎ
Рэдактар нумара Іван КАХНОВІЧ

Камп'ютэрная вёрстка: І.Дасько, А.Маісеянка, А.Цітова.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г.Мінск, вул.Б.Хмяльніцкага, 10а

прыёмная 68-28-02
аддзел рэкламы 68-29-33 (факс 68-29-74)
бухгалтэрыя 32-38-94

Газета выходзіць 1 раз у тыдзень на беларускай і рускай мовах

Распаўсюджваецца па тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у розніцу

Падпісчыкам газеты «Добры вечар» дастаўляецца **бясплатна**

Тыраж—55000 экз.
Падпісана ў друк 9 снежня

Заказ 3
Надрукавана ў друкарні выдавецтва «Беларускі Дом друку»
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

AD VOCEM

ТРЫАДЗІНЫ І ТРОХАБЛІЧНЫ,

або Ў ЧЫМ РОЗНІЦА МІЖ ГОСПАДАМ БОГАМ І ПРЭЗІДЭНТАМ

Некалі, у дзяцінстве, аніяк не мог дапетрыць, як гэта адзін Бог можа складацца з трох кампанентаў: Бацькі, Сына і Духа Святога. Я пакутаваў ад таго, што не мог зразумець, хто з іх самы галоўны? Чаму Ісус—Бог-сын, а маці яго—толькі святая, а не Багіня-маці? Чаму на іконах не малююць Бога-бацьку, а калі ён не мае чалавечага аблічча (аднак жа павінен мець, бо мы створаны па вобразу і падабенству ягонаму!), дык чым ён розніцца ад Духа? І г.д. і да т.п.

А пасля я трохі пасталеў, набраўся сякога-такога вопыту, уступіў у камсамол і прайшоў праз савецкае войска, і на сваёй шкуры зразумеў, што ў жыцці бываюць тэарэмы, а бываюць і аксіёмы.

Бог—аксіёма, не даказваецца і не аспрэчваецца. Ну і Гасподзь, як той казаў, з ім—хай сабе будзе трыадзіным.

Смешна прызнацца, але сёння, праз столькі гадоў, я зноў разгубіўся ад надта ж падобных пытанняў. Толькі аб'ектам цікаўнасці гэтым разам выступае жывы, абсалютна матэрыяльны чалавек—прэзідэнт маёй краіны. Я гляджу на яго, слухаю яго—і не даходзіць: дзе ён сапраўдны? Калі ён дэманструе нам сваё рэальнае аблічча? У які момант перад намі чалавек, якога мы абралі прэзідэнтам?

І што адметна—спісаць на аксіёму, як на нешта дадзенае, шматаблічнасць А.Лукашэнкі не ўдасца: прэзідэнт, пры ўсёй да яго павазе, усё ж яшчэ, дзякуй Госпаду, не Бог!

Прыклады? Ды на гэтым тыдні іх было колькі заўгодна!

Паехаў наш прэзідэнт па краіне вертыкаль сваю ўсталёўваць. Кандыдатаў на найвышэйшыя абласныя пасады вылучаць. І так яму праімпанаваў прыём, так даспадобы прыйшлося, што галасаванні амаль аднагалосныя,— ну, быццам лепшыя сябры і аднадумцы на сесіі прыходзяць! І пачаў наш прэзідэнт выказвацца. Пра тое, напрыклад, як прыбягалі ў яго кабінет адразу пасля знакамітага ўказа пра зніжэнне цэнаў акулы імперыялізму і тупацелі ад злосці нагамі за тое, што ён такі самастойны ў эканамічнай палітыцы і аніякі МВФ слухаць не жадае. Шык! Толькі праходзіць некалькі дзён, і аб'яўляецца новае павышэнне цэн, ды з якім каментарыем: мы, маўляў, адразу ж новы ўказ у МВФ паслалі, каб жа толькі там на нас крыж не паставілі. Бо, браце-спадарства, без іхніх крэдытаў нам эканомікі не падняць!

Вы, паважаны чытач, што-небудзь зразумелі? Дзеля чаго Беларусь, так бы мовіць, рабіла гэтыя свае сутаргавыя жэсты? І ў які момант прэзідэнт быў больш шчырым?

Ці, вось, у Будапешт, на сустрэчу кіраўнікоў дзяржаў-удзельніц НБСЕ паехаў. Выступіў з прамовай, у якой старшыню Нарады то «госпожой», то «господином» называў. (Спадарыня яна, не сумнявайцеся!) І словы прачулыя вымавіў: пра тое, як мы да дэмакратыі, да рынку і да Еўропы ідзём, аж падноскі грэюцца. За роўныя і добрасуседскія адносіны з усімі змагаемся. І дадаў: а вось NATO ля сваіх межаў не жадаем!

І ў Вышаградскую групу не жадаем. І Балтыйска-Чарнаморскага нафтавага калектара не жадаем.

Мы—за мір, вось толькі Польшча—як сябра NATO—вельмі страшная, а Расія—якая кідае войска без санкцыі свайго парламента супраць Чачні—сябра, таварыш, брат. І наогул, аніколькі мы яе не баімся. Лагічна, ці не так?

Аднак самая адметная падзея мінулага тыдня—чуткі пра адстаўку Віктара Ганчара. Шчыра кажучы, даўно, яшчэ пасля таго знакамітага тэлевыступлення, чакаў, хто першы не вытрымае прэзідэнцкай непрадказальнасці. Першым стаўся старшыня Белкаапсаюза, аднак тая сітуацыя ўсё ж не была такой адназначнай, як зараз.

А вось другім стаў В.Ганчар. Адзіны сапраўдны юрыст і адзіны сапраўдны інтэлігент (па вялікаму рахунку) у камандзе прэзідэнта. Чалавек, без якога прэзідэнт наўрад ці стаў бы прэзідэнтам. Чалавек, які шчыра і сумленна ўзяўся за паўнамоцтвы віцэ-прэм'ера па адукацыі, навуцы і культуры. Чалавек, з іменем якога звязваліся хоць нейкія спадзяванні (ну, не са спадаром жа Фядутай пра стан беларускамоўнага друку, напрыклад, размаўляць!).

І вось, кажуць, Ганчар адыходзіць. Рэакцыя прэзідэнта? «А мы в правительстве никого не держим!» У мяне—няма слоў! У Віктара Іосіфавіча, на мой погляд, таксама...

Ішоў Шцірліц па калідоры. Насустрач—Мюллер.

—Хайль Гітлер, группенфюрэр!

—Ай, не юродствуйце, Ісаеў...

Я пра што? Бог, у якім бы вобразе ні быў, застаецца Богам. А які ж на самай справе наш прэзідэнт?

МАКСІМ ГРЭК.

ЧУТКІ ТЫДНЯ

ХАЙ ІХНІЯ БЮДЖЭТЫ ЦЕРПЯЦЬ!

Па краіне ўпарта цыркулююць чуткі пра плануемае новае павышэнне цэнаў на ўсе без выключэння прадукты харчавання. Мяркуецца, што з 1 студзеня 1995 года кіло варанай кілбасы будзе каштаваць не менш за 100 тысяч рублёў, кіло свініны—у межах 250 тысяч, адно яйка—6 тысяч, бутэльку малака і гарэлкі можна будзе купіць за 25 тысяч.

Гэты крок урада (вымушаны, цяжкі для насельніцтва, але неабходны) дазволіць поўнасцю пазбегнуць датацый з дзяржаўнага бюджэту краіны і адначасова прымусіць беларускіх спажыўцоў, якія хочуць яшчэ есці, скупляць танныя расійскія, літоўскія, польскія і ўкраінскія прадукты. Такім чынам, нас будуць карміць Еўропа і Азія за іхні ж кошт!

Мінгарвыканкам прыступіў да будаўніцтва трох вялікіх вакзалаў—Віленскага ў Масюкоўшчыне, Маскоўскага—у Сцяпянцы і Кіеўскага ў Лошыцы. На Варшаву цягнікі будуць адпраўляцца з вакзала Мінск-Пасажырскі.

Інтэнсіўнасць руху электрапаяздоў з усіх чатырох вакзалаў да Масквы, Кіева, Варшавы і Вільні не павінна быць большай за пятнаццаць хвілін. Дэвіз праекта: хочаш хлеба—за суткі справішся!

МИЛОСЕРДИЕ НЕДЕЛИ



Сегодня, 9 декабря, Ксения, жительница Минска, поедет в аэропорт Минск-2, чтобы совершить первый в своей жизни полет на самолете—для лечения за океаном.

Тотальный аганглиоз кишечника—такой диагноз был поставлен ей в центре детской хирургии первой клинической больницы Минска. В переводе на обычный язык это означает полную неразвитость всего кишечника—он не может работать. Ксения всего три месяца живет на этом свете, и она обречена умирать, поскольку операции по пересадке кишечника делают лишь в нескольких центрах в мире. У нас, к сожалению, нет.

Но девочке, может быть, удастся выжить—о ней узнали в Соединенных Штатах, и одна из частных клиник в штате Калифорния взялась ее лечить бесплатно—сколько бы это ни стоило. А доставить до Америки сможет компания «Люфтганза», причем с пятидесятипроцентной скидкой. Недостающую сумму опять-таки доплатили американцы из Христианской миссии. Остается надеяться, что Ксения хорошо перенесет 14-часовой полет и ночь в клинике Франкфурта-на-Майне и будет готова к весьма сложной операции.

Фото Василия ФЕДОСЕНКО.



НАС ЧИТАЮТ.

Фото А.Гуриновича.

АНЕКДОТ ТЫДНЯ

Нам працягваюць званіць чытачы, якія прапаноўваюць самыя розныя анекдоты ў гэтую рубрыку. Лепшыя, як, напрыклад, гэты, дасланы мінчуком Д. з Серабранкі, мы друкуем. І чакаем новых прапаноў па тэлефоне 68-29-34 альбо пісьмова. Адзіная ўмова—надзённасць і дасціпнасць!

* * *

Ідзе мужык па праспекце Скарыны і крычыць:

—Я—Напалеон! Я—Банапарт!

Пад'ехала «хуткая» і адвезла яго ў Навінкі.

Ідзе другі мужык, тыцкае сябе пальцам у грудзі і заяўляе:

—Ён—прэзідэнт! Ён—прэзідэнт!

Пад'ехала «хуткая» і... адпусціла: сапраўды прэзідэнт!

ПУБЛІКАЦЫЯ ТЫДНЯ

П.ЯКУБОВІЧ: «ДЕГЕНЕРАТОРЫ ИДЕЙ»

(«Народная газета», 7 снежня.)

Знакаміты публіцыст Беларусі, спецыяліст у галінах палітыкі, культуры, спорту, міжнародных адносін і г.д. Павел Якубовіч выказаўся, нарэшце, болей, чым шчыра.

Новых выбараў, на думку паважанага мэтра, лідэры палітычных партый чакаюць толькі дзеля таго, каб «палепшыць свае жыллёвыя і іншыя пытанні» (гм-гм! Прабачце, вядома, але няўжо пытанні можна нейкім чынам «паляпшаць»?) Народ тым часам ўпэўнены, што «чым больш партый, тым таўсцейшае сала і смачнейшыя булкі». А таму, не адрозніваючы АДПБ ад НДПБ ці НПБ, спадар Якубовіч у дзень выбараў застанецца дома, з нятленнымі сваімі каштоўнасцямі: тэлевізарам і дэтэктыўчыкам. А там, глядзіш, яшчэ што-небудзь напіша—дэмакратычнае і публіцыстычнае.

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

НЯГЕГЛЫЯ КОЛАС І КУПАЛА ТАЛЕНАВІТЫ А.Р.Л.

Аляксандр Лукашэнка:

«Людзі, якія размаўляюць на беларускай мове, не могуць рабіць нічога, як толькі размаўляць на беларускай мове. Таму што па-беларуску нельга выказаць нешта вялікае. Беларуская мова—бедная мова. У свеце існуюць толькі дзве вялікія мовы—гэта расійская і англійская».

(Цытата прыведзена газетай «Свабода» ў допісе дэпутата Гомельскага гарсавета Леаніда Епішава.)

ПАРАДА ТЫДНЯ

Многія мінчане звяртаюцца ў штотыднёвік з адным і тым жа пытаннем: як лепш распарадзіцца імяннымі прыватызацыйнымі чэкамі?

Думаецца, ваша рашэнне будзе грунтавацца на добрай аснове, калі вы абмяняеце чэкі «Маёмасць» на акцыі фонду «Дайнова-Інвест». Экспертамі фонду распрацаваны шэраг інвестыцыйных праектаў, што датычацца энергетыкі, вытворчасці сучаснай складанай тэхнікі, металапрадукцыі, будаўніцтва, гандлю... Іх рэалізацыя павінна забяспечыць добры рост курсавой вартасці акцый фонду, а гэта значыць, добры даход для сваіх акцыянераў...

Вы запытаецеся: «Дайнова-Інвест» — гэта надзейна?»

Як нам стала вядома, большасць супрацоўнікаў фірмы «Дайнова» (і іх знаёмых) ужо прынялі рашэнне ўкладаць чэкі ў «Дайнову-Інвест».

Думайце самі! І чытайце на чацвёртай старонцы інтэрв'ю з прэзідэнтам «Дайновы», якое, магчыма, развеіць вашы сумненні.

КОНКУРС ТЫДНЯ

Старшыня Мінгарсавета Аляксандр **ГЕРАСІМЕНКА.**



Лідэр Беларускага згуртавання вайскоўцаў Мікола **СТАТКЕВІЧ.**



Лідэр жаночага хрысціянска-дэмакратычнага руху Людміла **ПЕЦІНА.**



Дэпутат Вярхоўнага Савета Станіслаў **ШУШКЕВІЧ.**



УСЕ МЫ РОДАМ З ДЗЯЦІНСТВА

Шчыра кажучы, не чакалі, што наш конкурс, у якім мы прапанавалі распазнаць на старых дзіцячых фатаграфіях сённяшніх знакамітых людзей горада і рэспублікі, выкліча такі ажыятаж у адрас рубрыкі. На рабочым стале ініцыятара конкурсу сёння ляжыць цэлая гара лістоў. І кожны з іх па-свойму цікавы. Якіх толькі версій няма! У дзіцячых рысах на фатаграфіях чытачы «ўбачылі» і **Аляксандра Лукашэнку, і Мечыслава Грыба, і Вячаслава Кебіча, і Зянона Пазьняка, і Галіну Сямдзянаву, і Інесу Драбышэўскую, і Аляксандра Фядуту, і Станіслава Багданкевіча, і Генадзя Карпенку, і Яфрэма Сакалова, і іншых.** Можа, гэта падстава для роздуму нашым палітыкам? Мусіць, вы ўсе ў нечым надта падобныя?

Але жарт жартам, а трэба, як і абяцалі, на поўным сур'ёзе падвесці вынікі конкурсу. Найбольш станоўчых адказаў прыйшло з нагоды фатаграфіі Аляксандра Герасіменкі і Станіслава Шушкевіча. Іх здолела распазнаць большасць нашых чытачоў.

Максімальнага выніку, назваўшы тры прозвішчы з чатырох, дасягнуў наш чытач **мінчанін Баеў, што пражывае на праспекце імя газеты «Известия».** (На жаль, ён не паведаміў свайго імя.)

Як мы і абяцалі, яму будзе ўручаны прыз ад спонсара конкурсу — **Бюро Міжнароднага маладзёжнага турызму «Спутнік» горада Мінска.**

Нам асабліва прыемна павіншаваць спадара Баева з перамогай, улічваючы, што мы наўмысна зрабілі ўмовы конкурсу дастаткова цяжкімі, пазбеглі даць партрэты так званых першых асоб, якія найчасцей мільгаюць на тэлеэкранах і ў газетах. Можа, нават занадта часта, бо, як мы пераканаліся па лістах, іх вобразы ўжо мрояцца многім грамадзянам.

А ўвогуле, добра тое, што мы пакрысе прызвычайваемся да шматаблічнасці палітычнага істэблішменту, адыходзім ад тых часоў, калі неслі на дэманстрацыях адны і тыя ж партрэты састарэлых правадыроў.

Можа, якраз тыя новыя людзі, якія заяўляюць аб сабе сёння на палітычнай арэне, і дапамогуць нам выбрацца, нарэшце, з зачараванага кола сённяшніх праблем?

Ва ўсялякім разе, варта лепей ведаць іх. І таму, як мы абяцалі, у наступных нумарах будуць надрукаваны інтэрв'ю з кожным з нашых герояў. Нагадаем, дарэчы, што вы таксама можаце задаць ім свае пытанні. Чакаем лістоў.

Акрамя таго, улічваючы вашы пажаданні, абяцаем неўзабаве правесці другі тур конкурсу «Усе мы родам з дзяцінства». Пераможцу, зноў-такі, чакае нядрэнны прыз. Так што тым, хто не атрымлівае «Сталіцу» ў якасці бясплатнага дадатку да «Добрага вечара», раім купляць у кіёсках наступныя нумары нашага новага штотыднёвіка.

Вядучая конкурсу Людміла КЛАСКОЎСКАЯ.


ПРАВИТЕЛЬСТВО «РАЗМОРОЗИЛО» ЦЕНЫ

На пресс-конференции 5 декабря премьер-министр Михаил Чигирь объявил о постановлении правительства отменить с 7 декабря прежнее решение о замораживании цен на основные продукты питания. По мнению премьера, вновь либерализованные цены на хлеб и мясопродукты поднимутся примерно на 30%, на молочные продукты — на 50%. Г-н Чигирь заявил, что решения о замораживании цен, повышении зарплаты и выплате дополнительных пособий привели к тому, что население получило и не отоварило 103 млрд. белорусских рублей (12,5 млн. долларов). По его словам, правительство не могло больше позволить себе покрывать из бюджета убытки, которые образовались на предприятиях пищевой промышленности вследствие замораживания цен. «Наша спешка обоснована еще и тем, что мы должны сообщить Международному валютному фонду о своей политике в области ценообразования», — сказал Михаил Чигирь. По словам премьера, в понедельник правительство направило фонду меморандум, в котором были подтверждены согласованные ранее с МВФ позиции. Г-н Чигирь заявил также, что предполагаемые шаги в области ценообразования были согласованы с президентом Лукашенко перед его отъездом на совещание СБСЕ в Будапешт.

Напомним, что указ президента о замораживании с 14 ноября цен на основные продукты питания заметно осложнил отношения белорусского руководства с МВФ. По словам представителя МВФ в Беларуси Вима Мидделкоопа, если заседание совета директоров МВФ по Беларуси не состоится до Рождества, то предоставление помощи будет отсрочено на несколько месяцев, поскольку придется еще раз согласовывать программные показатели. В случае же положительного решения МВФ, Беларусь уже в декабре-январе сможет получить вторую часть кредита на системные трансформации в сумме 128 млн. долларов и кредит stand by объемом 180 млн. долларов.

СИМ.

КУРС ТЫДНЯ



Сярэдні курс наяўнага долара ЗША ў банках Мінска з 2 па 8 снежня. 8 снежня на таргах Міжбанкаўскай валютнай біржы за 1 безнаяўны долар давалі 9180 BRB.

ПО 300г, НО БЕЗ КАРТОЧЕК

6 декабря многим минчанам, пытавшимся купить сливочное масло, пришлось уйти из магазина без покупки — продавцы требовали карточки. 7 декабря, позвонив в городское управление торговли, мы узнали, что карточки уже не нужны, масло продается свободно, но по 300 граммов на руки.

На вопрос «Почему уменьшилась норма отпуска?» заведующая продовольственным отделом управления торговли А.Г.ЕРОХИНА ответила:

— Начался ажиотажный спрос на этот продукт. За 4 дня в городе было продано 300 тонн масла. Хотя раньше ежедневная потребность составляла 20, максимум 30 тонн.

Вы же видите, что животное масло сейчас дешевле, чем растительное или чем маргарин. Вот люди и запасаются впрок. Много масла вывозится в другие республики, где оно значительно дороже. Именно поэтому горисполком предложил снова ввести продажу товара по карточкам, чтобы остановить вывоз и нормализовать отпуск. Но, обсудив этот вопрос в управлении, мы решили все же от карточек отказаться, потому что у многих людей их уже просто нет — выбросили за ненадобностью. Чтобы не создавать всем лишние проблемы, было решено уменьшить норму отпуска. Хочу еще раз сказать минчанам, что запасы масла у нас есть, в продаже оно будет, поэтому нет необходимости покупать его килограммами.

— А цены на этот продукт не изменятся в ближайшее время?

— Цены свободные, поэтому они зависят от производителя. Но торговая наценка на масло (оптовая и розничная) составляет всего 10%. Понижать уже некуда.

СЕЗОН ОТСТАВОК. *Заявил о своей отставке заместитель премьер-министра Виктор ГОНЧАР. Он выразил несогласие с политикой президента и с принципами работы Кабинета Министров. До принятия решения президентом и Верховным Советом ГОНЧАР будет исполнять свои обязанности.*



Сегодня днем по республике ожидается облачная погода. Местами, преимущественно по западу, осадки, гололед, на дорогах гололедица, в отдельных районах туман. Температура воздуха в Витебске (ночью минус 4-6, днем 0-минус 2), в Минске, Гомеле ночью минус 2-4, днем — около нуля.

В Могилеве ночью минус 3-5, днем около нуля. Гродно: ночью 0-минус 2, днем плюс 1-3. Брест: ночью минус 1-3, днем плюс 1-3.

В последующие двое суток ожидается облачная с прояснениями погода, временами осадки, слабый гололед. Ветер юго-западный, 6-11 метров в секунду, 11 декабря днем по северу республики порывы 15-18 метров в секунду.

Температура воздуха ночью минус 4-плюс 1, днем плюс 1-6 градусов.

В.ЧИЖИК, ведущий специалист БЕЛГИДРОМЕТА.

ЭКОНОМИЧЕСКАЯ НЕДЕЛЯ

ДЕРЖИ МЕНЯ, ВЕРЕВОЧКА, ДЕРЖИ...

Просто бессмысленно комментировать решение правительства о «размораживании» цен. Все ясно, все на прилавках, все тысячу раз говорено: и насчет дотаций, и насчет выбора. Выбор ведь какой был: либо дешевые молоко и колбаса, либо тепло в домах. Такая вот ситуация. Профсоюзы, конечно, на нее реагируют, трудящиеся — негодуют. Даже демократы эксплуатируют в предвыборных целях тезис об обнищании. Совсем как зюгановские коммунисты в России: глядишь, скоро и за серпы с молотами возьмутся. Еще бы! Ведь средний белорус сегодня получает в месяц уже на пять долларов меньше, чем украинец (в Беларуси 20 долларов, на Украине уже 25).

Очевидно, наступил момент, когда стране предстоит пройти по тонкой ниточке. Подобная ниточка ведет после смерти в рай любого правоверного мусульманина, обремененного накопленными за жизнь грехами. Дорога реформ сейчас сузилась именно до такой тонкой ниточки: оступился — падай в пропасть социальной нестабильности.

Очень опасным грузом на наши плечи, и в конечном счете на ниточку, которая держит всех нас над пропастью, может стать новогодний подарок, которого добиваются от администрации Лукашенко профсоюзы. Речь идет о возможном повышении минимальной зарплаты с 1 января 1995 года до 50 тысяч рублей. Если это будет сделано, разговоры о борьбе с инфляцией и о преодолении кризиса останутся разговорами. А цены вырастут, вновь обгоняя рост зарплат. Возникает вопрос: сколько может продолжаться хождение по кругу? Пока все не поймут порочность круга? Или — до последнего жителя Беларуси? Почему так резко, почему до последнего? Да потому, что не может быть богатой и будет обречена на прозябание и вымирание страна, которая не умеет распорядиться тем, что имеет. Страна, которая уже несколько лет подряд при старом правительстве и уже 4 месяца при новом повторяет в своем развитии одну и ту же незамысловатую траекторию — замкнутый круг.

Народ избрал Президента, чтобы разорвать этот замкнутый круг. Народ умеет терпеть. Те, кому надоело терпеть (слава Богу, их все больше), начали работать и зарабатывать — поверьте и проверьте, для этого сегодня необязательно заниматься воровством или, торгуя, становиться в ряды все еще презираемых в народе «спекулянтов». Но есть очень много людей в Беларуси, которые уже (или еще) не заработают. Им надо помогать. И вот сейчас, когда сделаны первые шаги по совершенствованию социальной помощи, которая должна стать адресной и помогать не «категории льготников», а конкретным нуждающимся людям, старая профсоюзная номенклатура и те, кто хочет заново сколотить политический капитал на рабочем движении, предлагают новое повышение минимальной зарплаты. Эти новые раздачи «пустых» денег потом будут компенсировать новым повышением цен и новым сеансом раздевания промышленности и предпринимательства через налоговую систему.

Впрочем, если белорусам нравится роль иждивенцев, привыкших к бесконечным подачкам «доброго» государства, почему бы и нет? Но эти подачки потом сразу же отбирают с процентами. Отбирает, как выясняется, все то же государство.

Вполне вероятно, что многим в нашем государственном аппарате тоже надоело это хождение по кругу. И они, эти многие, прекрасно все понимают. Но есть народ, который выбрал Президента именно за его предвыборные обещания в духе «всем все будет». Хотя жизнь учит другому. Поэтому и чиновники, и просто здравомыслящие люди беспокоятся. Не дай Бог, упасть в пропасть, увидеть белорусский бунт. Возможно, он сумеет быть поцивилизованнее русского. Но, наверняка, беспощаднее.

...Пройдем еще шажок по тонкой ниточке над пропастью. Все у нас получится. Только не будем сами себе гири к ногам привязывать.

Держи меня, веревочка, держи...

АНДРЕЙ ПОТРЕБИН.

МЫ ПРАЦАВАЛІ, ЯК УСЕ, АЛЕ ХАЦЕЛІ СТВАРЫЦЬ ФІРМУ, НЕ ПАДОБНУЮ НА ІНШЫЯ. КАЛІ ХОЧАЦЕ — НЕПАЎТОРНУЮ!

Карэспандэнт «Сталіцы» ЛЮДМІЛА КЛАСКОЎСКАЯ вядзе з прэзідэнтам фірмы «Дайнова» АДАМАМ ПАЛЮХОВІЧАМ гутарку, у якой, па ўзаемнай дамоўленасці, не згадваюцца словы «палітыка» і «камп'ютэр».

— Калі падбіраць эпітэт да назвы вашай фірмы, то першым чынам просіцца слова «беларуская». І адчуваецца, што нацыянальны каларыт, на якім будуецца імідж «Дайновы», — гэта не вонкавая бутафорыя, а сапраўднае крэда. Як вы прыйшлі да яго?

— Прабачце, але ж мы не ў Пуэрта-Рыка працуем. Мы — беларусы. Крыўдна, што проста многія ў нас забыліся, хто яны такія і адкуль родам.

Мы — беларусы, мы — тутэйшыя хлопцы. Мы робім сваю справу на роднай зямлі.

Увогуле, мне не вельмі падабаецца слова імідж. Яно пазначае нейкія вонкавыя рысы, а беларускасць «Дайновы» — гэта наша перакананне, наша сутнасць, наша крэда. Гэта — светапогляд людзей, якія стварылі фірму. І калі мы сабраліся разам, то стварыўся такі клімат, які падказаў нам і назву, і стыль, карацей, тое, што вы называеце іміджам.

Што да прынцыпаў, на якіх базуецца наша праца, дык тут у адной звязцы і філасофія, і тэхніка, і этыка.

Вярнуся, аднак, да вытокаў: у 88-м шэсць чалавек, сур'ёзных, высокаадукаваных спецыялістаў, ледзь убачыўшы законапраект аб кааперацыі, замахнуліся на ўласную справу. Так узнікла фірма, у якой кожны быў асобай і ведаў, што яму трэба ад гэтага жыцця. Мабыць, палову года карпелі над распрацоўкай праграмных сродкаў і тэхнічных прыстасаванняў да стандартных савецкіх і імпартных ЭВМ.

Але як з адных футбольных зорак не атрымаецца добрая каманда, так і з шасці лідэраў не атрымалася фірма. Мы разышліся, застаўшыся сябрамі, і сёння супрацоўнічаем, як незалежныя прадпрыемствы.

Недзе ў год удалося стварыць зусім новы калектыў, які заняўся распрацоўкай і продажам вылічальнай тэхнікі. У тым часе я і бачу парасткі сённяшняй «Дайновы».

Аб'ядналіся людзі, што мелі трывалы светапогляд і жадалі сур'ёзна працаваць у адной камандзе. Тут ужо былі адно дыханне, адна ідэя: стварыць фірму, якая стала б не столькі сродкам для атрымання грошай (для жыцця шмат грошай не патрэбна), колькі канцэптуальна нечым цікавым. Карацей кажучы, мы хацелі стварыць фірму са сваім абліччам, не падобную на іншыя, калі хочаце — непаўторную!

Сёння гэта жаданне не патухае. І я неаднойчы лаўлю сябе на думцы, што мы толькі пачынаем працу. І бачу, што гэта так, бо «Дайнова» накіравана на будучыню, яна той прамень, які пашыраецца. Гутарка не аб тым, што хочацца зарабіць, скажам, мільён ці мільярд долараў (фантастычныя лічбы, хаця на Захадзе для каго-кольвечы — гэта дзень учарашні). Я бачу сёння мэту іншай: зрабіць фірму, якая самарэгулюецца, самаарганізуецца і, у рэшце рэшт, скіравана на... недасягальны вынік. Так, і не трэба здзіўляцца. Вы, можаце, напрыклад, сказаць, якая мэта жыцця? Безумоўна, жанчына павінна выхоўваць дзяцей, а мужчына, скажам, пабудаваць дом. Але ж усё гэта нешта фрагментарнае, а трэба намагацца чагосьці суцэльнага, рухацца да таго, што недасягальнае. Кожная дробная мэта — толькі прыступка да той, агульнай. А ў такім разе будзе заўсёды перспектыва развіцця.

І мы проста працуем, ведаючы: ёсць яшчэ рынкі, на якіх «Дайновы» няма. Нездарма адзін вялікі чалавек сказаў: імкніся да немагчымага і дамажашся жадаемага.

— Памятаеце, герой Ільфа і Пятрова Шура Балаганаў сцвярджаў, што для поўнага шчасця яму патрэбны 6 тысяч 400 рублёў і што «з гэтай сумай яму будзе на свеце вельмі добра». Што, у такім выпадку, патрэбна вам для поўнага шчасця? І ці далёка да гэтага ідэалу?

— Гэтае пытанне задае сабе кожны чалавек. У свой час, калі я вучыўся ў інстытуце, мне для поўнага шчасця не хапала аўдыёапаратуры, каб атрымліваць асалоду ад добрых запісаў. Вось такая мэта жыцця была ў 18-гадовага юнака.

І толькі пасталеўшы, разумееш, што шчасце — гэта не штосьці статычнае альбо рай, дзе так добра! Шчасце, гэта, як і мэта альбо праца, — працэс, што дастаўляе асалоду таму, хто ў ім удзельнічае. І няхай я не буду арыгінальным, усё ж скажу, што сам працэс — гэта ўсё. Уявіце, што вы закахаліся. І што, сядзець склаўшы рукі і радавацца гэтаму? Не, зразумела. Трэба нешта рабіць, працаваць над сабой, каб даказаць сваё каханне і выклікаць адказнае пачуццё. Так і з грашамі... Навошта іх шмат? Асалоду дае адчуванне таго, што ты робіш нешта прыгожае.

У жыцці «Дайновы», дарэчы, было колькі мэт. Зарабілі свой першы мільён рублёў. (Сёння гэта ўжо проста смешна!) Ён стаў маленькай пляцоўкай для будучай працы — зборкі, заказаў і продажу ЭВМ. Усё на гэтым? Не, на рынку ёсць патрэба ў метале, чаму б яе не рэалізоўваць? Канешне, выбіраеш заўсёды тое, што па сілах. І так склалася, што многія задумы «Дайновы» дасягаліся зусім не проста.

Сёння мы больш вольныя ў гэтым сэнсе. Ёсць нішы, якія мы трывала занялі — пастаўкі чорнага металу (дарэчы, тут даводзіцца працаваць і працаваць з прадпрыемствамі-пастаўшчыкамі, з той жа чыгункай, рынкам, бо патрапіць туды зараз зусім не проста). Але сёння нам прасцей, таму што сёння ёсць «Дайнова» з яе вопытам, іміджам, і кожны новы напрамак хоць у нечым (звычайна, шмат у чым) падобны на ўжо зведаныя.

— Адам, а калі б вы не сталі бізнесменам, то...

— Магу адказаць дакладна: калі б у сілу пэўных абставін прыпынілі працу камп'ютэрных і металічных прадпрыемстваў, мы б сваёй камандай шылі чаравікі ці рабілі нешта іншае — працы хапае. Альбо я з задавальненнем працаваў бы ў вёсцы, маючы кавалак глебы.

— Як вы ставіцеся да фразы класіка вечна жывога вучэння пра тое, што «ўсё буйное сучаснае багацце нажытае несумленным чынам»?

— Я, безумоўна, добра памятаю гэтага класіка, дакладней, усіх трох. Хачу толькі паралельна заўважыць, не адказваючы на гэтае пытанне, бо яно рытарычнае: грошы нажываюцца рознымі шляхамі, як правільнымі, так і няправільнымі. Адны іх проста крадуць, другія зарабляюць уласным мазалём. Можна працаваць незаконна, гандляваць, напрыклад, наркотыкамі і купацца ў раскошы, а можна гандляваць прыгожымі швейнымі вырабамі і таксама мець добры дастатак. Па сутнасці, справа падобная, але вынікі розныя.


Я думаю, што класікі, здараецца, і памыляюцца. І мы ведаем на практыцы, што гэтыя класікі якраз і памыліліся. Хаця, з другога боку, лічу, што такога кшталту глыбінных прапрацовак, як тая ж палітычная эканомія капіталізму Маркса (зробленая для яго часу), зараз няма.

— Прывесці фірму да такога поспеху можа, відаць, толькі чалавек з рацыянальным мысленнем. Між тым, рэклама «Дайновы» — гэта ўзор рамантычнасці. Як вы растлумачыце такі парадокс?

— Наша рэклама — вынік калектыўнай працы. Што тычыцца прыгожых віншаванняў, — гэта робіцца адным чалавекам, і я яго хачу назваць — Мыцык Галіна Васільеўна, выдатны і прыгожы чалавек. Усе астатнія, хутчэй, толькі крытыкі.

Ведаеце, калі б у нас пераважаў рацыяналізм, мы з самага пачатку б давалі рэкламу на рускай мове. Я, у прынцыпе, лічу: немагчыма жыць толькі рацыянальным мысленнем. Бо не менш важная частка нашага жыцця, як і фірмы, дарэчы, — нерацыянальная. Я, напрыклад, як чалавек веруючы, перакананы, што гэты фактар таксама істотна ўплывае на працу.

Хутчэй за ўсё, гармонія ў жыцці асобы ці фірмы мае пад сабой спалучэнне рацыяналізму і рамантызму. Але па сутнасці і адукацыі (я матэма-



тык) заўсёды добра пралічваю ўсе зыходныя даныя, што паўплываюць на справу, і толькі потым прымаю рашэнне.

— Наколькі вядома, новыя кадры ў вашу фірму прыходзяць па рэкамендацыях тых, хто там працуе, у тым ліку і сваякоў. Гэты кадравы прынцып заўсёды сябе апраўдвае і не дае асечак?

— Крышку папраўлю: па рэкамендацыях тых, хто ў нас працуе даўно і мае вялікі аўтарытэт. Каго можна ведаць лепш, чым сваіх суседзяў, сваякоў ці аднакурснікаў?

Такі кадравы падыход лічу з самага пачатку знаходкай. Падбор супрацоўнікаў у «Дайнову» для нас з'яўляецца прынцыповым: наколькі чалавек вядомы і прадказальны, прафесіянал альбо не, ці ёсць жаданне працаваць не толькі тут, але і над сабой. Калі хоць адно звяно з ланцуга выпадае, — складана трапіць у «Дайнову».

Праўда, з усіх правілаў бываюць выключэнні. Нядаўна да нас прыйшлі працаваць дзевяць студэнтаў прама з універсітэцкай лаўкі. А ўвогуле, сёння ў «Дайнове» працуюць 120 чалавек.

— Адам, вы робіце ўражанне чалавека, які не ведае ніякіх сумненняў. Гэта сапраўды так?

— Працуючы ў сённяшнім асяродку, трэба абавязкова мець канкрэтнае мысленне. Таму ўсялякія сумненні імкнуся адганяць.

— У якім коле і якім чынам вы любіце бавіць вольны час? Бачна, што вы ў добрай спартыўнай форме...

— Ну, гэта форма ўсёй фірмы сёння. Двойчы на тыдні мы ходзім у лазню і таксама двойчы гуляем у футбол. Не толькі з мэтай фізічнага аздараўлення, але і з мэтай эмацыянальнай, ні з чым не параўнальнай разрадкі. Што б ні здарылася, а ў 21.00 у будні ці ў 10.00 у выхадныя усе прыходзяць на гульню. І зусім не таму, што гэта загад, а таму, што гэта ўжо традыцыя. Дарэчы, праводзім нават першынство і кубак «Дайновы» па футболу.

Люблю музыку, а больш за ўсё джаз, рок, аматар аўтарскай песні (выпадзе вольная хвіліна — і сам бяру ў рукі гітару). Праўда, такіх хвілін у маім жыцці не дужа багата, таму музыку часцей за ўсё слухаю падчас службовай вандроўкі ў аўтамабілі.

— У кожнага з нас на свеце ёсць мясціна, куды мы вяртаемся, каб прыхіліцца да першазданнай чысціні. А ў вас, Адам, ёсць такая мясціна?

— Ёсць, але гэта не горад і не вёска, а поле. Год колькі таму, калі я жыў у Паўночным пасёлку, пастаянна рабіў прабежкі ў навакольны лес. І часцяком прыпыняўся каля старых разгалістых дубоў, каб з замілаваннем палюбавацца іх шатамі. Прытулішся да шурпатай кары і адчуваеш, як бурляць жыватворныя сокі нашай глебы, як яны праходзяць праз цябе, і ты зліваешся з вечнасцю...

— Ваш ідэал жанчыны?

— Людміла, я лічу, што ідэальныя жанчыны жывуць у нас, у Беларусі. Я шмат паездзіў па свеце, пабываў амаль ва ўсіх кутках былога Саюза, краінах Еўропы, у Амерыцы — ёсць з чым параўноўваць! Гэта тычыцца і знешніх даных, і асабістых якасцей жанчын.

А ідэальных, якія мне падабаюцца, я вызначыў бы так: жанчыны з трывалым і мяккім характарам, разумнымі вачамі і нашай звычайнай прыгажосцю.

— Ці даў вам Бог магчымасць у поўнай меры пазнаць шчасце сапраўднага кахання?

— Я пакрыўлю душой, калі скажу, што не. Каханне — гэта той наркотык, які патрэбны любому чалавеку.

А ўвогуле, самае прыгожае, што існуе ў свеце, гэта жанчына. Гэтае ўсведамленне прыходзіць да мужчыны з гадамі.

— Колькі ж тады, цікава, мужчыне трэба пражыць і чаго дасягнуць, каб зразумець гэта?

— Я думаю, што ён ніколі да канца так і не зразумее гэтага, хаця чым больш жыве, тым больш гэта становіцца зразумелым. Але, памятаеце ў Сакрата, «я ведаю толькі тое, што нічога не ведаю»?

— Вам бывае адзінока?

— Ведаеце, Людміла, я ўпэўнены, у кожнага чалавека ёсць у жыцці перыяды, калі ён сам сабе здаецца зусім адзінокім. І я не лічу, што гэта дрэнна, бо ў такія хвіліны ёсць магчымасць падумаць аб вечным. Зразумела, што і я тут не выключэнне.

— Якія вам бачацца сны?

— На жаль, сны мне бачацца не часта. А калі і бачацца, дык, слава Богу, не звязаныя з працай. Не, не ў ружовых колерах, і ў снах сваіх я даўно ўжо не лётаю. Памятаю, маці так тлумачыла: калі ў сне падаеш ці лётаеш — значыцца, расцеш. Вырас ужо!

— Адам, вы так добра ведаеце беларускую мову...

— Дзякуй, і буду шчырым: пабеларуску я актыўна размаўляю з 88-га года. Павага і інтарэс да роднага слова ад продкаў, ад вёскі. Я з маленства ўсмоктваў «деревенскую» мову, хоць сам размаўляў на «городском языке». Але калі з хлопцамі ў вёсцы гулялі ў вайну, дык абавязкова крычалі: рукі ўгору, а не рукі ўверх!

Так што беларускасць — мой шлях у жыцці. Я прыйшоў да ўсведамлення таго, што трэба быць тым, кім ты народжаны.

— Ваша пажаданне тым, хто перажывае сёння матэрыяльныя цяжкасці і адчувае няўпэўненасць у заўтрашнім дні...

— Мне могуць сказаць: добра, маўляў, Палюховічу разважаць на гэтую тэму... І тым не менш: трэба працаваць, спадзявацца і ў любым выпадку не апускаць крылы, палічыўшы, што табе ў жыцці не пашанцавала.

Дарэчы, тыя хлопцы, што сёння працуюць у «Дайнове», таксама з простага асяродку. Бацька ўсё жыццё слясарыў, маці да гэтага часу, нават у свае 67 гадоў, працуе кандуктарам прыгарадных маршрутаў, адказваючы на ўсе прапановы дзяцей пайсці на пенсію: «Навошта? Што дома рабіць? Трэба працаваць абавязкова. Там людзі, там жыць цікава».

Нельга ніводную хвіліну думаць, што ўсё бесперспектыўна, трэба быць аптымістам і з надзеяй глядзець у будучыню. Але менавіта актыўным, а не пасіўным. Бо ёсць жаданне пасіўнае: нядрэнна, маўляў, было б заўтра атрымаць мільён рублёў. А ёсць і актыўнае: я хачу заўтра атрымаць мільён і буду шукаць працу, дзе змагу яго зарабіць!

— Дзякуй за гутарку — і плёну «Дайнове!»

— Мае пажаданні Вашаму цікаваму не па ўзросту выданню — захаваць гэтую тэндэнцыю, стаць лепшым і цікавейшым штотыднёвікам як мага хутчэй. Поспехаў вам і мільённага накладу!

ФОТА А.КЛЯШЧУКА.

ПОМНИМ ЛИ МЫ О СВОИХ ПРАВАХ?

Что ни день в Республиканском обществе защиты потребителей раздается около сотни звонков. Обманутые покупатели обращаются именно сюда, потому что сегодня обратиться за помощью больше некуда.

— Каждый такой звонок — это крик души, — рассказывает председатель общества ВЯЧЕСЛАВ БОРИСОВИЧ ЛИЕВ. — Раньше куда люди ходили жаловаться? В партком, райком партии и так далее. Сегодня — как-будто никому ничего не нужно, никто ни за что не отвечает. Купил человек некачественный товар. Что с ним делать — он не знает. Десятки раз обив пороги мастерских и магазинов, возвращается домой ни с чем. Почему? Потому что не знает своих прав. Хотя удивления это не должно вызывать. Даже в таких цивилизованных рыночных государствах как Англия, Франция, Япония, США, где очень широк спектр потребительских организаций, по проведенным опросам выяснилось, что лишь 15-20 процентов населения знает свои потребительские права. Так что говорить о нас? Поэтому задач и проблем у нашего общества защиты потребителей чрезвычайно много. Во-первых, нам как воздух нужен свой журнал. Мы уже договорились с известным немецким центром исследований «Штифтунг Варентест» о проведении ими экспертиз на качество нашей продукции. В основном это, конечно, отечественная сложная бытовая техника, реализуемая на нашем рынке. Думаю, договоримся, наконец, и об издании журнала. Вопросы финансирования немцы берут на себя.

Работаем над проектом серии публичных лекций для населения. Естественно, они будут бесплатными. Готовим также несколько семинаров для товаропроизводителей, для активистов потребительского движения, для работников госучреждений, занятых защитой прав потребителей. Ведь после выхода Закона уже появились некоторые законодательные акты, в какой-то мере перечеркивающие его действие. Например, в Законе о защите прав потребителей определено, что во время ремонта некачественного товара продавец или завод-изготовитель обязан безвозмездно предоставить на время ремонта новый товар. То есть, чтобы потребитель мог пользоваться аналогичными правами. Одно из постановлений Совмина утверждает, что на время ремонта новый товар не предоставляется. Закон говорит одно, правительство — совершенно другое...

Кроме всего прочего, общество, заручившись поддержкой руководителя администрации президента, начнет готовить проект государственной программы по защите прав потребителей. Программ у нас уже было немало, но эта, — безусловно, важна и актуальна. Права потребителя — это права человека. И хоть с этим у нас напряженка, будем надеяться на лучшее. А что еще остается?!

ИРИНА ГЕРМАНОВИЧ.

ИЗ СУДЕБНОЙ ПРАКТИКИ

ВЫ КУПИЛИ ПУТЕВКУ

Но рекламные обещания разошлись с действительностью.



Рекламодатель отвечает за объективность публикуемых сведений о товаре или услуге. Во всем мире эта истина не вызывает сомнений. У нас ей еще только предстоит утвердиться. Возьмите любую газету, и вы увидите множество рекламных объявлений, приглашающих изумительно провести свой отдых.

Минчанка С., воодушевившись газетным объявлением, обещающим сказочный отдых на «златых пясках» Болгарии, 7 июня приобрела в турагентстве «Красия» две путевки: для себя и сына. Перелет туда и обратно организовывал «Белинтурист», которому и было заплачено 265 долларов за два билета в обе стороны.

26 июля, отдохнувшая и счастливая, женщина с ребенком возвращалась домой. И каково же было ее удивление, когда в аэропорту выяснилось: улететь она не может, так как ее нет в списках. Представитель «Белинтуриста» предложил ей подождать. Если будет дополнительный рейс — она улетит. Если нет... Когда путешественница все-таки села в самолет — новая проблема. Есть только одно место. Вот так и пришлось ей лететь из Бургаса в Минск с сыном на руках на одном месте.

28 июля наша минчанка обратилась к директору «Белинтуриста» с просьбой компенсировать ей стоимость одного авиабилета. В ответ ей было предложено получить один миллион рублей, что составляло лишь половину стоимости. С чем, естественно, она не согласилась.

Продав билеты, «Белинтурист» вступил в гражданско-правовые отношения с клиентом, т.е. взял на себя обязательства по организации услуги. Однако обязательства свои не выполнил. Это дает право другой стороне — потребителю услуг — потребовать возмещения убытков.

Из чего складываются убытки, которые понесла минчанка С.?

Во-первых, стоимость билета.

Во-вторых, и это самое главное, — моральный ущерб.

31 октября народный суд Центрального района г.Минска удовлетворил исковое заявление гражданки С. Ей было возмещена стоимость билета и нанесенный моральный ущерб.

Остается добавить, что интересы потребителя защищал и представлял юрист Общества защиты потребителей.

КСТАТИ

ТАИНСТВЕННЫЕ СЛОВА

На каждой вещи, будь то блузка, пальто или шапка, всегда на ярлыке есть символы. Они подсказывают, как правильно стирать, гладить и сушить, какие стиральные порошки можно использовать, а какие — нельзя.

Кроме символов, встречаются еще пояснения по уходу за одеждой, написанные, как правило, на английском языке.

Надпись:

— «Dry clean only» означает, что изделие необходимо сдавать в химчистку;

— «Hand wash only cold» предупреждает вас о том, что вещь можно стирать только в холодной воде;

— «Finse» означает полоскание;

— «Drip dry do not wring» — сушить, не выжимая;

— «Keep away from the red flame» — держать далеко от открытого огня;

— «Wash dark colours separate» — стирать одежду темных цветов отдельно;

— «Machine wash warm» — машинная стирка в теплой воде;

— «Do not iron» — не гладить.

Теперь, когда вам проще понять эти надписи, имейте в виду еще одно: подобных «советов» вы не встретите на изделиях «высокой моды» и на товарах китайского производства.

ИРИНА АЛЕКСАНДРОВА, ИНАП КОНФОР.

ЧАЙ — НАПИТОК МУДРЕЦОВ

Философы чаепития рассматривают историю человечества под своим углом зрения: они разделяют народы на пьющие кофе и пьющие чай. И если первые отличаются лихорадочным, агрессивным поведением, то любителей чая характеризуют стоическое спокойствие и взвешенная рассудительность.

Это факт: чай способен и успокаивать, и возбуждать. Своим на первый взгляд противоречивым действием чай обязан двум дополняющим друг друга веществам, входящим в его состав. Это кофеин, известный ранее под названием теин, и танин (дубильная кислота). В черном чае, в зависимости от места сбора и ферментации, содержится от двух до четырех процентов кофеина, почти в два раза больше, чем в поджаренном кофе.

Как показали исследования, проведенные «Штифтунг Варентест», в пакетиках чая весом 1,5-2 грамма содержится от 42 до 74 миллиграммов возбуждающего алкалоида. Однако кофеин, содержащийся в чае, растворяется лишь на две трети. Кофеин, входящий в кофе, практически полностью переходит в напиток, при этом кофе еще и заваривают крепче, чем чай. В результате, в чашке чая содержится от 30 до 60 миллиграммов кофеина, а в чашке кофе — от 80 до 120 миллиграммов. Еще одно различие: возбуждающее действие кофеина при употреблении кофе наступает сразу, при употреблении чая оно тормозится дубильной кислотой. Стимулирующее воздействие на кровоснабжение головного мозга и центральную нервную систему сказывается через какое-то время, но зато продолжается дольше. Дубильные кислоты, содержащиеся в чае, не только тормозят действие кофеина, но и дают успокаивающий эффект, — во всяком случае, на желудок и кишечник.

Варьируя дозировку и время, в течение которого настаивается чай, можно совершенно индивидуально регулировать различное действие на организм кофеина и танина. Для получения бодрящего напитка следует взять больше заварки и настаивать ее не более трех минут. За это время в напиток переходит значительная часть кофеина. Тот же, кто хочет получить целебное питье при желудочно-кишечных заболеваниях, должен взять заварки поменьше, но настаивать ее в течение длительного времени для того, чтобы растворилось как можно больше дубильных веществ. Однако полностью устранить действие кофеина, как это зачастую предполагается, не удается. Чай — это всегда напиток бодрости.

В черном чае содержатся некоторые витамины и многие минеральные вещества, прежде всего калий, марганец и фтор. Как показали наши исследования, в одной чашке чая содержится от 0,29 до 1,17 миллиграмма фтора. Доза примерно в 1,5 миллиграмма покрывает ежедневную потребность во фторе и служит для профилактики кариеса. Правда, в очень больших количествах (речь идет уже о граммах) фтор может неблагоприятно сказываться на состоянии зубов и костей.

ПО МАТЕРИАЛАМ НЕМЕЦКОГО ПОТРЕБИТЕЛЬСКОГО ОБЩЕСТВА «ШТИФТУНГ ВАРЕНТЕСТ»

ПОЛЕЗНО ЗНАТЬ

КОЕ-ЧТО О ТАИНСТВЕННОМ ИНДЕКСЕ «Е»

В свое время население взбудоражила сенсационная новость: таинственные индексы «Е» на упаковках импортных товаров указывают якобы на то, что товар произведен с использованием опасных для здоровья канцерогенов.

Все необходимые разъяснения по этому поводу были даны во втором номере журнала «СПРОС», где был опубликован перечень злосчастных «Е» с разрешениями на их использование и в продуктах питания. Согласно этому списку **всерьез нужно опасаться только тогда, когда вы увидите на упаковке один знак — «Е-240» (формальдегид).** Это единственное вещество, канцерогенность которого доказана экспериментами.

